# БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ І ПРАБЛЕМА ПАЛІТЫЧНАГА САМАВЫЗНАЧЭННЯ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД З 1915 Г. ПА 25 КАСТРЫЧНІКА 1917 Г.

**Кардубан М.М.**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г.Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Янкоўскі Ю.Ю. —выкладчык*

Даследавалася развіццё беларускага нацыянальнага руху на тэрыторыі Расійскай імперыі як на тэрыторыі этнічнага пражывання, так і за яе межамі, а таксама на тэрыторыі, акупаванай Германскай імперыяй, ва ўмовах Першай сусветнай вайны. Разглядаліся перадумовы стварэння ўласнай беларускай дзяржаўнасці, якія ўзніклі і дзейнічалі ў той перыяд.

Асноўнымі палітычнымі стратэгіямі на пачатку 1915 г. былі краёўніцтва, аўтаномія ў складзе дэмакратычнай Расіі і поўная незалежнасць. Дэмаграфічныя змены і змены ў этнічным складзе насельніцтва, якія адбыліся на тэрыторыі Беларусі, вельмі негатыўна паўплывалі на развіццё нацыянальнага руху.

Самым значным цэнтрам беларускага нацыянальнага руху на акупаваных тэрыторыях стала Вільня. У 1915 г. быў створаны Беларускі народны камітэт (БНК), у склад якога ўваходзілі прадстаўнікі віленскага камітэта Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ), Беларуская сацыял-дэмакратычная работніцкая група і Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (БТДПВ). Асноўнымі стратэгіямі БНК з’яўляліся краёўніцтва — адраджэнне незалежнасці Літвы і Заходняй часткі Беларусі ў форме ВКЛ з сеймам у Вільні, якое не знайшло падтрымкі з боку германскіх улад і літоўскай Тарыбы, і стварэнне ў чэрвені 1917 г. арганізацыі “Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі”, на мэце якой было абвяшчэнне незалежнай дэмакратычнай Беларусі ў яе этнаграфічных межах, аб’яднанне ўсіх беларускіх земляў, падзеленых фронтам і далучэнне беларускіх прадстаўнікоў да міжнароднай мірнай канферэнцыі.

Мінск стаў другім цэнтрам кансалідацыі беларускіх нацыянальных сіл. Пачынаючы з 1917 г., ён стаў асноўным і па сваім уплыве пераўзышоў Вільню. Пасля Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 25 сакавіка 1917 г. была адноўлена дзейнасць БСГ, якая прытрымлівалася аўтанамісцкіх пазіцый; у Мінску адбыўся першы яе з’езд. З 25 па 27 сакавіка 1917 г. адбыўся I Кангрэс беларускіх нацыянальных арганізацыі, дзе быў створаны Белнацкам. Была прынятая дэкларацыя да Часовага ўрада з патрабаваннем аўтаноміі для Беларусі. Аднак Часовы ўрад, як і ўлады Расійскай імперыі, не прызнавалі беларусаў і іх права на самавызначэнне. У траўні 1917 г. узніклі ліберальная Беларуская партыя народных сацыялістаў (БПНС) і правацэнтрысцкая Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД). З 4 па 5 чэрвеня 1917 г. адбыўся II з’езд БСГ у Петраградзе. З 8 па 12 ліпеня 1917 г. у Мінску адбыўся II з’езд беларускіх партый і арганізацый, на якім была створана Цэнтральная рада беларускіх арганізацый (ЦРБА), яе асноўнымі праграмнымі патрабаваннямі з’яўляліся перадача зямлі без выкупу працоўнаму народу, прызнанне аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі, развіццё нацыянальнай культуры і мовы, арганізацыя беларускага войска. 18—24 кастрычніка адбыўся з’езд беларусаў-вайскоўцаў Заходняга фронту, на якім была прынятая рэзалюцыя аб пашырэнні беларускіх вайсковых фармаванняў і абраная Цэнтральная беларуская вайсковая рада (ЦБВР). З 15 па 24 кастрычніка пры ўдзеле прадстаўнікоў ЦБВР адбылося пасяджэнне ЦРБА, якая стала палітычным цэнтрам Беларусі і пачала называцца Вялікай беларускай радай (ВБР). У склад ВБР, што выступала за стварэнне незалежнай беларускай дзяржавы, увайшлі прадстаўнікі БСГ, БПНС і БХД. З 14 па 25 кастрычніка адбыўся III з’езд БСГ, на якім назіраліся пэўныя разыходжанні з ВБР праз больш левую пазіцыю БСГ.

Такім чынам, можна канстатаваць, што ў перыяд з 1915 г. па 25 кастрычніка 1917 г. беларускі нацыянальны рух эвалюцыянаваў ад ідэй аўтанамізму і краёўніцтва да поўнай незалежнасці і ўзнікнення ўласнай беларускай дзяржаўнасці. Узнік моцны падмурак, які дапамог склікаць Першы Усебеларускі кангрэс і потым рэалізаваць гэтую ідэю, стварыць першую беларускую дзяржаву.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Беларусь у першай сусветнай: агульная даведка // Нацыянальная бібліятэка Беларусі |Электронны рэсурс. —Рэжым доступу: https://www.nlb.by — Дата доступу: 07.02.2024.*

*2. Численный и социальный состав городского населения Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі |Электронны рэсурс|. — Рэжым доступу: https://niab.by/newsite/ru/artuh — Дата доступу: 07.02.2024.*